

# 8-га САКАВІКА – ДЗЕНЬ ЖАНЧЫН. СА СВЯТАМ!

Русский сонет

## Женщине

*Ты – женщина, ты – книга между книг,*
*Ты – свернутый, запечатленный свиток;*
*В его строках и дум, и слов избыток,*
*В его листах безумен каждый миг.*



*Ты – женщина, ты – ведьмовский напиток!*
*Он жжет огнем, едва в уста проник;*
*Но пьющий пламя подавляет крик*
*И славословит бешено средь пыток.*

*Ты – женщина, и этим ты права.*
*От века убрана короной звездной,*
*Ты – в наших безднах образ божества!*

*Мы для тебя влечем ярем железный,*
*Тебе мы служим, тверди гор дробя,*
*И молимся – от века – на тебя!*

*В. БРЮСОВ.*

ГАЗЕТА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ

# ГОМЕЛЬСКІ УНІВЕРСІТЭТ



№ 5 (1038) | ЧАЦВЕР, 6 сакавіка 2003 г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года | Выходзіць два разы ў месяц | Цана дагаворная



Чем больше мы живем на этой прекрасной планете Земля, тем острее и глубже ощущаем, что все лучшее в этом мире – от Женщины, ее доброты и щедрости, сравниться с которой может лишь сама Природа. Не случайно все самые чудесные слова – женского рода: земля и любовь, надежда и красота, радость и жизнь, вера и судьба, нежность и мудрость…

С именем женщины в наши души и жизнь приходит весна, начинающаяся чудесным, удивительным праздником 8 Марта. Чудесным потому, что празднуется в ту пору года, когда все вокруг просыпается от зимней спячки, а удивителен он тем, что придумали его… сами женщины!

Первая страничка в истории этого праздника была открыта 8 марта 1880 года, когда работницы нескольких предприятий Нью-Йорка вышли на демонстрацию, требуя улучшения условий работы и повышения зарплаты. Вторая – в 1910 году, когда в Копенгагене была проведена международная конференция женщин-социалисток, съехавшихся из 16 стран мира. Присутствовавшая на ней Клара Цеткин и предложила назвать этот день – 8 марта – Международным женским днем и ежегодно отмечать его.

Ушла в прошлое социальная острота этого события, и остался только праздник, приобретший иное звучание, общечеловеческое, а не социальное. Так что если бы не было реального события, вызвавшего эту праздничную традицию, то праздник чествования женщин следовало бы придумать и установить на весну, потому что значение роли женщин в обществе велико, и они заслуживают восхищения, любви и поклонения.

Женщина – начало всех начал, все в мире от нее и все – для нее. Ее прославляли в веках, ее рисовали Леонардо да Винчи и Рафаэль, Кустодиев и Савицкий; о ней писали Стендаль и Бальзак, Петрарка и Шекспир, Пушкин и Блок, Кулиев и Гамзатов.

Много прекрасных женщин работает и в нашем университетском коллективе. Они являются эталоном обаяния и энергии. Что греха таить: наши ученые дамы в любом деле могут даже превзойти мужчин и при этом не терять своей женственности. Главный их секрет – в удивительной уверенности в себе, безудержной энергии и умении добиваться поставленной цели. Не легок их преподавательский труд, ибо ведут они за собой молодежь в прекрасную страну знаний, отдавая при этом жар своего сердца и щедрость души. Нельзя не восхищаться стремлением трудиться и приносить пользу наших многочисленных обаятельных сотрудниц, многие из которых работают в нашем коллективе не одно десятилетие. Не без гордости можно говорить и о студентках, успешная учеба которых может служить достойным примером для сильной мужской половины.

С праздником весны, дорогие женщины! Здоровья Вам, счастья, вечной молодости и красоты, успехов в работе и учебе, семейного благополучия!

**РЕКТОРАТ, ЖЕНСОВЕТ, ПРОФКОМ, ПРОФКОМ СТУДЕНТОВ.**

## ДЫПЛОМЫ – ЗА СТУДЭНЦКІЯ ДАСЛЕДАВАННІ

Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь адзначыла Дыпломамі за якаснае кіраўніцтва навуковымі даследаваннямі студэнтаў вучоных нашага універсітэта: загадчыкаў кафедр – геалогіі і разведкі карысных выкапняў дацэнта **ТРАЦЭЎСКУЮ Алену Юр'еўну**, фізіялогіі чалавека і жывёлін – дацэнта **ЕЎТУХОВУ Ларысу Аляксандраўну**, экалогіі – дацэнта **КУСЯНКОВА Аляксандра Мікалаевіча**, дацэнта кафедры лёгкай атлетыкі і лыжнага спорту **СЕЎДАЛЁВА Сяргея Уладзіміравіча**, дацэнта кафедры матэматычных праблем кіравання **ДАЛІНСКАГА Міхаіла Сямёнавіча**, дацэнта кафедры дыфураўненняў **ФІЛІПЦОВА Уладзіміра Фёдаравіча**, ст.выкладчыка кафедры АЛФК **ПАДАСІНАВА Васіля Дзмітрыевіча.**

## НА САВЕЦЕ УНІВЕРСІТЭТА

У апошні чацвер лютага адбылося чарговае пасяджэнне Савета універсітэта. Пасля заслуханых інфармацый намеснікаў старшынь прафкама і прафкама студэнтаў Т.А. Валчковай, Т.В. Маславай і галоўнага ўрача санаторыя-прафілакторыя А.М. Сабалеўскага абмеркавана пытанне аб арганізацыі аздараўлення студэнтаў і супрацоўнікаў універсітэта ў 2002 годзе.

Па інфармацыі прарэктара па вучэбнай рабоце С.Ф. Каморнікава падведзены вынікі конкурсу на лепшы падручнік і вучэбна-метадычны дапаможнік і разгледжана пытанне аб рабоце факультэтаў па распрацоўцы і ўкараненню ў вучэбны працэс вучэбна-метадычных комплексаў. Зацверджаны план мерапрыемстваў па падрыхтоўцы ВМК.

33-м студэнтам універсітэта, якія дасягнулі поспехаў у вучобе, навуковай дзейнасці, прызначана стыпендыя Савета ВНУ. Па гэтым пытанні выступіла начальнік вучэбнага аддзела Н.І. Папкова.

На вакантную пасаду загадчыка кафедры гісторыі Беларусі абраны к.г.н., дацэнт В.П. Пічукоў і прынята рашэнне хадайнічаць перад ВАКам аб прысваенні вучонага звання дацэнта к.т.н. А.В. Варуеву з кафедры АСАІ.

Па інфармацыі прарэктара па навуковай рабоце Д.Р. Ліна ўнесены змены ў Палажэнне аб конкурсе на лепшыя навукова-даследчыя работы, прынята рашэнне аб адкрыцці дактарантуры па спецыяльнасцях "Беларуская літаратура", "Руская мова".

Савет зацвердзіў парадак фінансавання заданняў ДПФД на 2003 год, тэмы кандыдацкіх і доктарскіх дысертацый.

Разгледжаны таксама іншыя пытанні універсітэцкага жыцця.



**Настрой у чацвёртакурсніцы факультэта замежных моў Ірыны Логвінавай па-сапраўднаму святочны і прыўзняты. За асаблівыя поспехі ў вучэбна-пазнавальнай і навукова-даследчай дзейнасці ёй прызначана стыпендыя Спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па сацыяльнай падтрымцы адораных навучэнцаў і студэнтаў. Пасведчанне стыпендыята ёй уручыў рэктар ГДУ прафесар М.В. Селькін на пасяджэнні Савета універсітэта.**

Фота У.ЧЫСЦІКА.

## З УЗНАГАРОДАЙ!

*За шматгадовую плённую вучэбную і выхаваўчую работу па падрыхтоўцы маладых спецыялістаў, актыўны ўдзел у грамадскім жыцці асістэнт кафедры рускага, агульнага і славянскага мовазнаўства* ***ШАЎЧЭНКА Таццяна Яўгенаўна*** *ўзнагароджана Ганаровай граматай універсітэта.*

## ВІНШУЕМ!

***Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, калектыў кафедры давузаўскай падрыхтоўкі і прафарыентацыі горача віншуюць асістэнта названай кафедры ФІЦНЕР Таццяну Адамаўну (навуковы кіраўнік д.ф.н., прафесар І.Ф. Штэйнер) з паспяховай абаронай дысертацыі на атрыманне вучонай ступені кандыдата філалагічных навук.***

Імі ганарыцца універсітэт

# ЖЫЦЦЁ ПА МАКСІМУМУ

***Яна любіць першае веснавое свята з яго высокім блакітам неба, яркімі промнямі ласкавага сонейка і атрыманымі ў падарунак галінкамі сціплай мімозы ці букеціка пяшчотных цюльпанаў. І прачынаюцца пасля доўгай, бясконцай зімы нейкія патаемныя струны душы...***

У Марыі ніколі не згасае агеньчык зацікаўленасці да ўсяго, што акаляе яе ў студэнцкім жыцці. І больш таго – па-за яго межамі, бо яна знаходзіць час пабываць таксама на розных навуковых канферэнцыях, літаратурных вечарынах, імпрэзах, што адбываюцца і не ў сценах універсітэта, прычым, часта з'яўляецца і актыўным іх удзельнікам, а не проста пабочным сузіральнікам. Гэта – у яе характары: браць з жыцця максімум магчымага для праверкі сваіх здольнасцей, самаўдасканалення, сцвярджэння асобы.

Студэнтку 3 курса філалагічнага факультэта спецыяльнасці "Беларуская мова і літаратура" са спецыялізацыяй "Англійская мова", стыпендыятку імя Я. Коласа Марыю Страха ведаю не першы год. Шмат разоў прыходзіла яна ў рэдакцыю нашай універсітэцкай газеты са сваімі заметкамі, нататкамі аб цікавых мерапрыемствах, сустрэчах, што адбываліся на філфаку і не толькі на ім. І заўсёды быў у яе свой асабісты, цікавы погляд на тое, аб чым дзяўчына пісала ў сваіх матэрыялах, нейкая чуйная іскрынка яе душы, якая не магла не прываблівацъ.

Медыцына ці філалогія?.. Гэтая дылема паўстала перад Марыяй пасля заканчэння з залатым медалём сярэдняй школы ў г. Ветка. Аб першай марыла яшчэ з маленства, неаднойчы ўяўляла сябе ў бялюткім халаце доктаркі, якая дапамагае людзям пераадолець боль і хваробы. Але ж і праца настаўніка, які "лепіць" з дзіцячых душ Чалавека, Асобу, ёй таксама падабалася. Ёй цікава, захапляльна было ў віры школьнага жыцця, у якім яна лічылася не толькі выдатніцай, але і нязменным арганізатарам, удзельнікам разнастайных цікавых конкурсаў (нават не толькі школьных, але і раённага, абласнога ўзроўняў), мерапрыемстваў, у якіх часта прызнавалася пераможцай. І невыпадкова ў 11-ым класе стала дыпламантам Савета па падтрымцы таленавітай і творчай моладзі Гомельскага аблвыканкама ,



Канчатковы выбар будучай прафесіі Марыя зрабіла ўсё ж на карысць працы педагога. Відаць, перамаглі гены: хаця маці і бацька былі далёкія ад філалогіі (эканаміст і аграном), а вось у дзядулі – Мікалая Назаравіча Воінава – выдатніка адукацыі рэспублікі, былога завуча, дырэктара школы на Веткаўшчыне, які закончыў у свой час Гомельскі педынстытут імя В.П. Чкалава, прызванне аказалася што ні на ёсць педагагічнае... У яго, відаць, і пайшла ўнучка.

І цяпер Марыя Страха з поспехам спасцігае педагагічную навуку на філалагічным факультэце нашага універсітэта.

– Я вучуся на "выдатна" не дзеля павышанай стыпендыі, – адзначае Марыя, – мне вельмі важна, у першую чаргу, праверыць свае сілы, сцвердзіцца перад самой сабой, адбыцца як асоба. Калі стаўлю перад сабой нейкую мэту, абавязкова павінна яе дасягнуць. Не люблю песімістаў, пасіўных людзей, якія скардзяцца на сумную аднастайнасць. Усё ж залежыць ад самога чалавека...

Такое жыццёвае крэда дзяўчыны дапамагае ёй не толькі ў вучобе, але і ў навуковых даследаваннях, як у роднай літаратуры, так і ў мове. Часта па асабістай ініцыятыве яна рыхтуе даклады, выступленні для навуковых канферэнцый розных узроўняў – ад факультэцкага да рэспубліканскага. Яе мара – у будучым прысвяціць сябе навуцы філалогіі. Але гэта – наперадзе, пакуль жа – нястомная дарога да ведаў. Няхай прывядзе яна Марыю да ажыццяўлення ўсяго задуманага.

**Т. НІКАЛАЕВА.**

**НА ЗДЫМКУ: М. СТРАХА.**

**Фота У.ЧЫСЦІКА.**



*Забудьте, джентльмены, о том, что самая первая женщина — это Ева, самая красивая — Клеопатра, самая умная — Жорж Санд. На самом деле самая первая, красивая и умная женщина — та, что рядом с вами!*

# ІМЯННЫЯ СТЫПЕНДЫЯТЫ

**На падставе рашэння Савета універсітэта ад 30 студзеня 2003г. па выніках зімовай залікова-экзаменацыйнай сесіі 2002-2003 навучальнага года назначаны імянныя стыпендыі:**

ІМЯ Я.КАРСКАГА

**(з 1 студзеня па 30 красавіка)**

**Алене КУПО** – студэнтцы 5 курса гістарычнага факультэта спецыяльнасці "Гісторыя" з дадатковай спецыяльнасцю "Англійская мова".

ІМЯ П.БРОЎКІ

**( з 1 снежня 2002 па 30 чэрвеня г.г.)**

**Канстанціну ДЕГЦЯРОВУ** – студэнту 5 курса юрыдычнага факультэта спецыяльнасці "Правазнаўства".

ІМЯ Я.КОЛАСА

**( з 1 лютага па 31 ліпеня )**

**Марыі СТРАХА** – студэнтцы 3 курса філалагічнага факультэта спецыяльнасці "Беларуская мова і літаратура" са спецыялізацыяй "Англійская мова ".

ІМЯ К.КРАПІВЫ

**( з 1 студзеня па 30 чэрвеня)**

**Дзмітрыю СІМАНЕНКУ** – студэнту 5 курса матэматычнага факультэта спецыяльнасці "Матэматыка".

ІМЯ Ф.СКАРЫНЫ

**( з 1 студзеня па 30 чэрвеня)**

**Святлане ЛІН** – студэнтцы 5 курса эканамічнага факультэта спецыяльнасці «Эканоміка і кіраванне на прадпрыемстве».

**(з 1 лютага па 30 чэрвеня)**

**Таццяне АНІСЬКОВАЙ** – студэнтцы 3 курса фізічнага факультэта спецыяльнасці "Фізіка" (вытворчае аддзяленне).

**(з 1 лютага па 31 ліпеня)**

**Уладзіміру СЕМЯНЦОВУ** – студэнту 4 курса факультэта фізічнай культуры спецыяльнасці "Фізічная культура і спорт".

Прафсаюзнае жыццё

# ПРАЦАВАЦЬ У КАНТАКЦЕ

**На пасяджэнні прафкама універсітэта абмеркаваны пытанні аб стане ТБ і аховы працы на біялагічным і эканамічным факультэтах, падведзены вынікі на лепшую прафсаюзную арганізацыю ГДУ, зацверджаны каштарыс і план работы прафсаюзнага камітэта на 2003 г.**

З інфармацыяй па першаму пытанню выступілі дэканы В.І. Талкачоў і Т.В. Карпей. Адзначана, што сур'ёзных парушэнняў правілаў ТБ і аховы працы на біялагічным і эканамічным факультэтах не дапускаецца, вядзецца мэтанакіраваная работа па забеспячэнню належных умоў працы для іх калектываў. Тыя праблемы, якія часам і ўзнікаюць (напрыклад, недастатковае асвятленне ў студэнцкіх аўдыторыях у час заняткаў у другую змену) вырашаюцца ў рабочым парадку. Выступаючых дапоўніў старшыня камісіі прафкама па ТБ і аховы працы А.М. Семянкоў, які паведаміў, як ухіляюцца раней выяўленыя камісіяй у час праверкі недахопы па стану ТБ на фізічным факультэце.

У пасяджэнні прафкама прыняў удзел і выступіў рэктар прафесар М.В.Селькін, які падкрэсліў важнасць усталяваных цесных кантактаў у рабоце паміж кіраўніцтвам, адміністрацыяй і прафсаюзнай арганізацыяй універсітэта па вырашэнню ўзнікаючых пытанняў і праблем. Міхаіл Васільевіч адказаў таксама на зададзеныя яму пытанні.

# ЭКАНАМІСТЫ І ФІЗІКІ – ЛІДЭРЫ

Не першы раз ва універсітэце праводзіўся конкурс-агляд на лепшую прафсаюзную арганізацыю ГДУ. Камісія падвяла вынікі сёлетняга конкурсу і вызначыла пераможцаў. З паведамленнем аб гэтым выступіла старшыня камісіі дацэнт кафедры гісторыі Беларусі Т.І. Язэпава. Яна адзначыла, што прафсаюзныя арганізацыі закліканы абараняць інтарэсы свайго калектыву і кожнага чалавека асобна. Праформі працуюць з людзьмі і для людзей. На жаль, некаторыя з іх пры падрыхтоўцы справаздач аб праведзенай за год рабоце не назвалі ў іх ніводнага прозвішча, ніводнай лічбы, падышлі да гэтай важнай справы фармальна, хаця ў членаў камісіі не было сумнення, што пэўная работа на гэтых факультэтах праводзілася. Такія "сухія" справаздачы прадставілі матэматычны і гістарычны факультэты, са спазненнем, не ў поўным аб'ёме яны былі пададзены на разгляд камісіі ад іншых факультэтаў і падраздзяленняў. Самым сур'ёзным чынам аднесліся да справы фізічны, юрыдычны факультэты, факультэт замежных моў.

Згодна Палажэння вынікі конкурсу падводзіліся па 4-х раздзелах – "Сацыяльная абарона", "Маральна-псіхалагічны клімат у калектыве", "Арганізацыйная работа прафактыву" і "Узаемадзеянне з прафкамам і ўдзел ва агульнауніверсітэцкай прафсаюзнай арганізацыі". На самым высокім узроўні па першаму з іх наладжана работа на эканомфаку (старшыня прафбюро А.Л.Вайцішкіна). Добра працуюць таксама ў гэтым напрамку на фізічным факультэце (праформ М.М.Фядосенка), філфаку (А.А.Дарафеева), факультэце фізічнай культуры (В.П.Крукоўскі), на юрфаку (З.А.Гулевіч).

Яшчэ адзін красамоўны паказчык прафсаюзнай работы – стварэнне маральна-псіхалагічнага клімату ў калектыве. Камісія на падставе прадстаўленых факультэтамі матэрыялаў засведчыла, што ён у калектывах універсітэта здавальняючы, у многім зыходзіць ад рэктарата і прафкама універсітэта, у аснове яго ляжыць патрабавальнасць, добразычлівасць і справядлівасць. Адсутнічалі канфлікты на фізічным, эканамічным, матэматычным, факультэтах замежных моў, псіхалогіі і давузаўскай падрыхтоўкі, біяфаку, філфаку, гістфаку. А там, дзе яны ўзнікалі, вырашаліся ў калектывах пры садзеянні прафбюро і прафкама універсітэта.

На ўсіх факультэтах і ў падраздзяленнях, як адзначыла камісія, праводзяцца прафсаюзныя сходы, вядзецца неабходная дакументацыя. Але не ўсе вытрымалі экзамен на стойкасць. Калі прафсаюзныя ўзносы ў канцы мінулага навучальнага года перасталі вылічвацца цэнтралізавана праз бухгалтэрыю і іх трэба было плаціць кожнаму члену прафсаюза самастойна па ведамасцях, некаторыя выкладчыкі і супрацоўнікі і праявілі сябе: забыліся, што прафсаюзы – гэта тая адзіная грамадская арганізацыя, якая не на словах, а на справе абараняе інтарэсы працоўнага чалавека. Калі ў нас усё добра (юбілей, розныя святы, агеньчыкі, мерапрыемствы на факультэтах і г.д.), мы звяртаемся ў прафкам. А калі бяда (хвароба, смерць родных, блізкіх) – таксама ў прафкам. Многія палічылі, што прафсаюз ім больш не патрэбны. З прафарганізацыі ГДУ ў вясенне-летні перыяд 2002 г. выйшлі звыш за 100 чалавек, і больш за ўсіх у АГЧ.

З задавальненнем камісія адзначыла, што актыўна, па-дзелавому ўзаемадзейнічаюць з прафкамам і прымаюць удзел у агульнауніверсітэцкай прафсаюзнай арганізацыі праформі А.Л. Вайцішкіна, М.М. Фядосенка, З.А. Гулевіч, А.А. Дарафеева, В.П. Крукоўскі, І.З. Алеўская, А.А. Вішанкова.

Па выніках усіх 4-х раздзелаў конкурсу месцы размеркаваліся ў наступным парадку: І-е месца падзялілі прафбюро эканамічнага (старшыня А.Л. Вайцішкіна) і фізічнага (М.М. Фядосенка) факультэтаў. На ІІ-м месцы – філфак (А.А. Дарафеева) і факультэт замежных моў (Г.У. Лоўгач). У тройку пераможцаў увайшлі таксама юрфак (З.А. Гулевіч) і факультэт фізічнай культуры (В.П. Крукоўскі). На наступных месцах матфак, АГЧ, біяфак, факультэт псіхалогіі і давузаўскай падрыхтоўкі, гістфак, ІВЦ і геолага-геаграфічны факультэт.

Факультэты-пераможцы, якія ўвайшлі ў тройку лідэраў, заахвочаны матэрыяльна: за І-е месца – па 50 тыс.руб., ІІ-е – па 40 тыс.руб., ІІІ-е – па 30 тыс.руб.

**(Наш кар.)**

Студэнцкім талентам – падтрымку

# ЗА ПОШУК, ТВОРЧАСЦЬ, ІНІЦЫЯТЫВУ



Нямала сярод студэнцкай моладзі нашага універсітэта асоб творчых, неардынарных, хто не толькі паспяховую вучобу лічыць сваім галоўным абавязкам. Ім цікава яшчэ займацца навукова-даследчай работай, для якой ёсць на факультэтах адпаведныя ўмовы, а галоўнае – выкладчыкі, пад кіраўніцтвам якіх таленавітыя юнакі і дзяўчаты могуць праявіць свае здольнасці. Гэта пацвярджаюць факты, якіх не аднясеш да разраду будзённых. Яны – адметныя, і імі наш універсітэт можа па праву ганарыцца: ужо чатыры студэнцкія навукова-даследчыя лабараторыі ГДУ за вялікія дасягненні і поспехі адзначаны грантамі Савета спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па сацыяльнай падтрымцы адораных навучэнцаў і студэнтаў. СНДЛ "Навукова-метадалагічныя праблемы выкладання фізікі", якая працуе пры кафедры агульнай фізікі, стала ўладальніцай такога гранта зусім нядаўна. Варта нагадаць, што на фізічным факультэце гэта не першы студэнцкі творчы калектыў, які заахвочаны на такім высокім узроўні: у 2001 г. Дыплома Савета спецыяльнага фонду і матэрыяльнай падтрымкі была ўдастоена СНДЛ "Электроніка" (кіраўнік – ст.выкладчык кафедры агульнай фізікі І.М. Якаўцаў).

Тэматыка, па якой вядуцца студэнцкія даследаванні ў нядаўна адзначанай грантам лабараторыі, – разнастайная. Яна ўключае пытанні педагогікі і дыдактыкі вышэйшай і сярэдняй школы, выкарыстання метадалагічных і метадычных прынцыпаў у навучанні, пошуку новых тэхналогій у адукацыі і інш. Яе дэвіз "Развіццё самастойнага мыслення праз самастойную дзейнасць" ёмiста і дакладна характарызуе сэнс той работы, якая тут праводзіцца.

Безумоўна, добра зладжанага калектыву, пад сілу якому вырашэнне пастаўленых задач, не бывае без сапраўднага кіраўніка. Шмат якімі якасцямі яму трэба валодаць – як прафесійнымі, так і чыста чалавечымі. Гэты сінтэз – залог поспеху ў любой справе. Старшы выкладчык кафедры агульнай фізікі Тамара Пятроўна Жалонкіна – з ліку такіх кіраўнікоў. На чале ўдастоенай гранта лабараторыі яна ўжо не першы год. І вынік яе працы з творчай моладдзю відавочны.

**Атрыманая фінансавая дапамога ў памеры 2 млн. руб. ад Савета спецыяльнага фонду па сацыяльнай падтрымцы адораных навучэнцаў і студэнтаў дазволіла ўмацаваць матэрыяльна-тэхнічную і метадычную базу СНДЛ: набыты і ўсталяваны сучасны камп'ютэр, праца на якім дапамагае студэнтам пры правядзенні навуковых даследаванняў.**

**Фота У.ЧЫСЦІКА.**

## ПОЛОЖЕНИЕ

**о конкурсе на лучшую статью, доклад, выступление о СЭЗ «Гомель-Ратон», посвященных 5-летию СЭЗ.**

**1. Общее положение**

Цель конкурса: активизация работы по привлечению инвестиций в СЭЗ «Гомель-Ратон» и проведение рекламной кампании по освещению деятельности СЭЗ «Гомель-Ратон» и её роли в экономике.

**2. Условия конкурса**

Конкурс проводится среди: профессорско-преподавательского состава, научных сотрудников, аспирантов, молодых ученых и специалистов, студентов и журналистов области.

Предлагаемые для участия в конкурсе работы представляются на бумажном и электронном носителе.

**3. Порядок проведения конкурса**

Конкурс проводится с ***1 марта по 10 мая 2003 года.***

Материалы для участия в конкурсе представляются в администрацию СЭЗ «Гомель-Ратон» по адресу: 246000 г. Гомель, ул. Федюнинского, 4, факс: 57 92 91, e-mail: info@gomelraton.com , не позднее ***10 мая 2003 года.***

Результаты конкурса подводятся жюри конкурса.

Творческое произведение – победитель конкурса с указанием фамилии автора будет опубликовано в сборнике материалов научно-практической конференции «СЭЗ «Гомель-Ратон»: 5 лет на экономической карте Гомельской области. Опыт, тенденции, перспективы».

Итоги конкурса подводятся не позднее ***31 мая 2003 года.*** Справки по телефонам: 58-22-94, 58-22-74.

**Учреждение призов и награждение победителей**

Администрация СЭЗ «Гомель-Ратон» учреждает победителю конкурса призы, подарки, денежные премии.

**Состав жюри конкурса**

| | |
|---|---|
| **БЫК** Владимир Федорович | - глава администрации СЭЗ «Гомель-Ратон» |
| **БОБРИК** Владимир Андреевич | - декан филологического факультета ГГУ им. Ф. Скорины |
| **ТРЕТЬЯКОВ** Владимир Константинович | - зам. главы администрации по маркетингу |
| **ХАНЕНЯ** Сергей Иванович | - зам. декана по воспитательной работе филфака ГГУ им. Ф.Скорины. |
| **ЛУГОВОЙ** Виктор Алексеевич | - редактор отдела журнала «СЭЗ» |

Как живется студентам-иностранцам

# В ДРУГОЙ СТРАНЕ, ВДАЛИ ОТ ДОМА...

**Им трудно переносить славянские морозы и бывает очень неуютно серой осенью. Они держатся особняком, своими группами. Недоверчивы, но рады общению с добрыми людьми. Они не похожи на нас внешне, у них особые культурные традиции, наконец, их музыкальный язык не спутаешь ни с каким другим. Преподавателям с ними нелегко, но они стараются помочь им адаптироваться к учебному процессу. Белорусские студенты относятся к ним лояльно, хотя иногда не без доли иронии. Они – из страны, вместе с которой когда-то мы начинали строить «светлое будущее». Они приезжают в Гомель из Китайской Народной Республики, чтобы получить образование в одном из самых престижных ВУЗов Беларуси – в Гомельском государственном университете им. Ф.Скорины.**

*На каких основаниях молодые люди из Китая поступают в наш университет? Какие факультеты предпочитают? Каким образом происходит адаптация студентов к нашим социально-экономическим и учебно-воспитательным условиям? С этими и многими другими вопросами я обратилась к заведующему отделом международных связей ГГУ В.И.СОБОЛЕВИЧУ.*

– Наш университет завоевал высокую репутацию на международной арене в сфере образования, – говорит Василий Иванович, – поэтому процесс обучения иностранных студентов у нас четко налажен и имеет давнюю традицию. В настоящее время в ГГУ обучается 57 человек из стран ближнего зарубежья и 68 граждан КНР. Китайские студенты получают высшее образование на базе Гомельского университета с 1992 г. Некоторые из них оканчивают у нас аспирантуру, защищают кандидатские диссертации. Преподаватели вузов из КНР также нередко приезжают в Гомель, чтобы пройти здесь научную стажировку.

В настоящее время в Гомельском университете учатся китайцы из провинций Цзянсу, Шандон, Хэнан, из городов Пекин, Шанхай, Нанкин... Как правило, это ребята из обеспеченных семей, но которые в то же время успешно окончили школу. Регистрация молодых китайцев, желающих пройти обучение в ГГУ, осуществляется через китайские вузы, с которыми в 1999 г. наш университет заключил договора о сотрудничестве: Янчжоуский университет и Сюйчжоуский педагогический университет. Привлекает китайцев престиж нашего вуза, получение после окончания обучения диплома государственного образца, с присвоением ученых степеней бакалавра или магистра. Экономический факультет считается самым популярным. Это объясняется востребованностью экономических специальностей в КНР. В настоящее время по специальности «Мировая экономика и международные экономические отношения» обучаются 30 китайских студентов. Второе почетное место принадлежит филологическому факультету, специальности «Русский язык и литература» (20 человек). По окончании филфака они возвращаются домой, чтобы преподавать русский язык в вузах своей республики или работать переводчиками. Китайские студенты также проходят курс обучения на математическом и юридическом факультетах. 11 человек осваивают русский язык на подготовительном отделении.



Администрация университета, в частности, отдел по международным связям, создает все условия для безболезненной адаптации китайских студентов: дифференцированный подход обучения, опытные преподаватели, неплохие бытовые условия в общежитии (предоставление одноместных комнат); студентам, по каким-либо причинам не освоившим годовой курс обучения, дается возможность повторить его.

– Китайские студенты ничем не отличаются от белорусских, – продолжает Василий Иванович Соболевич, – среди них .тоже есть «отличники» и «лентяи». Но большинство из них все же более серьезно относятся к учебе, по сравнению с нашей молодежью. Это и понятно: они приезжают сюда учиться. Это – их главная задача.

Я решила непосредственно пообщаться со студентами из КНР, тем более, что 1 февраля по лунному календарю их страна встречала Новый год (Чжун Цзе).

Большинство старшекурсников к тому времени уехали в родной Китай (время каникул и обучения у нас совпадают). Общение с оставшимися по каким-либо причинам в Гомеле ребятами мне принесло немало впечатлений. Поначалу, правда, пришлось подключить все свое обаяние и приложить максимум усилий, чтобы установить с ними контакт. И я была очень приятно удивлена, открыв для себя интересных, незаурядных, а главное, – доброжелательных людей. Первой моей собеседницей оказалась Се Цзюань («по-нашему» Света), которая в 2002 г. окончила филологический факультет и уже год проходит стажировку на кафедре русского, общего и славянского языкознания. Света собирается поступать к нам в аспирантуру, с очень глубоким уважением отзывается о своем научном руководителе профессоре Владимире Ивановиче Ковале. «Мне нравится жить в Беларуси, – говорит она, – у вас очень спокойно, а главное – добрые люди».

Света рассказала, что праздник Нового года китайцы встречают исключительно семьями. На улицах горят огни, развешены гирлянды, – словом, все, как и у белорусов. На внешней стороне дверей, на стены в доме, на окна китайцы в канун Нового года наклеивают красную бумагу, на которой черными буквами пишут пожелания родным и близким. Красный цвет в Китае считается традиционным цветом счастья, даже свадебный наряд у невест нередко такого цвета.

Меня удивило, что национальное блюдо у китайцев – пельмени. «Для нас пельмени – это как для вас картошка, – улыбается Света. – Они начиняются мясом или овощами». Помимо пельменей в Китае любят пирожки. Об этом мне рассказал студент 2 курса экономического факультета специальности «Мировая экономика и международные экономические отношения» Бэй Цзянфэн. Бэй говорит, что в Беларуси не умеют делать пирожки («очень твердые»). Кстати, он рассказал интересную легенду: с давних времен в Китае считают, что на Новый год все злые животные (духи) выходят из своих жилищ, чтобы убивать людей. Поэтому красный цвет бумаги выполняет еще и оборонительную функцию. Бэй приехал в Гомель из г. Тэй Джоу. Поступать в Гомельский университет ему посоветовали родители. Уже третий год (включая л/о) он учится у нас. И, как сам говорит, не жалеет, ему нравится. Хотя... Он никак не может привыкнуть к расположению корпусов, которые находятся далеко от общежития, а ходить на учебу, особенно зимой, холодно. Вообще, Бэй показался мне этаким философом: довольно замкнут, задумчив, любит в одиночестве гулять по гомельскому парку. Ему нравится наша природа. Еще он посещает цирк, театр. «Я с удовольствием хожу на площадь во время праздников. У вас все очень красиво проходит,» – говорит он. Но труднее всего Бэю дается русский язык.

Всего 4 месяца обучаются на подготовительном отделении Лю Цзя (Зоя) и У Чунь Янь (Елена). Хотя общаться мне с ними пришлось на китайско-русско-английском диалекте, но я получила огромное удовольствие от разговора с этими жизнерадостными и приветливыми девушками. «У вас в Беларуси очень красивые девушки, а мужчины очень высокие и с чувством юмора», – отметила Елена. А Зоя восхищена преподавателями университета: «Они более общительны и близки к студентам, чем в Китае. Наши только учат, а ваши могут поговорить на разные темы, даже пошутить».

К концу разговора девушки включили мне песни известного китайского певца Рен Сенти. Из магнитофона звучала романтическая мелодия и пел приятный мужской голос. Я смотрела на как-то поникнувших и загрустивших девушек и думала: «Они так похожи на нас, потому что они тоже любят, скучают, помнят...»

**Т.ЦЕЛЕХОВИЧ.**

**НА СНИМКЕ: Го Шаочиань – студент 4-го курса филологического факультета. Вечерами после занятий он с удовольствием читает «Евгения Онегина» А.С. Пушкина.**

**Фото В. ЧИСТИКА.**

---

**ГРАФИКА XXI ВЕКА**
**ХУДОЖЕСТВЕННЫЙ АЛЬБОМ**




**Интервью**

***Я вижу то, что я рисую, я рисую то, что вырастает на листе бумаги. И игра начинается только тогда, когда я ставлю последнюю точку. Последняя точка на бумаге означает начало жизни, новой легенды в этом мире.***

**А. ЯКУШЕНКО.**

**(Комментарии к художественному альбому «Черная линия»).**

# НАСТРОЕНИЕ ЛИНИЙ

**Недавно в выставочном зале нашего университета была представлена персональная выставка «Линии тела» и «Крылья» выпускника филфака ГГУ Александра Якушенко, художника, работающего в стиле графики. Ей предшествовало издание художественного альбома «Черная линия» – итог долгой работы.**

**– Александр, как же ты «докатился» до такой жизни?**

– Дело в том, что я знаю очень многих людей в Гомеле, которые создают картины, пишут стихи, занимаются другими, не менее интересными вещами. Но то, что они делают, к сожалению, не востребовано в том городе, где они живут. И если они являются Именами в определенных кругах, и они не должны здесь ничего доказывать, то существует огромное количество молодежи и не только, которые наблюдают за происходящим, осознают свою невостребованность. И поэтому мы с другом решили, что эти интересные вещи могут быть интересны не только знакомым, друзьям, родственникам, но и другим людям. Необходимо только постараться донести это до них. А наш проект ставит перед собой цель доказать, что это реально сделать в наших тяжелых условиях. Хочу подчеркнуть, что это наш собственный проект, он – некоммерческий.

**– «Черная линия» – почему?**

– Я занимаюсь графикой, а она предполагает оперирование двумя цветами: черным и белым. «Белая линия» – не звучит, а вот «Черная линия» – самое подходящее название.

**– Стоит ли задавать вопрос, для кого предназначен твой альбом?**

– Мы для себя не определяем ни возрастную категорию, ни род занятия. Главный критерий – это «чтобы было интересно».

**– Почему твои работы не имеют названия?**

– Названия не имеют совершенно сознательно. У каждой работы есть какое-то свое особенное настроение. И если настроение человека, который увидел эту работу, совпадает с моим, то у него появится название. А если я назову свою работу, то тем самым сознательно ограничу зрителя в его восприятии рисунка. Ответил?

**– Вполне, спасибо.**

**Вопросы на твоей афише звучат так: «Вы когда-нибудь летали во сне? А, может быть, летаете и сейчас? Вы чувствуете крылья за своей спиной? А какого цвета эти крылья?» Какие ответы ты сам дашь на них?**

– Эти вопросы нужны для того, чтобы зритель на них отвечал. На первый из них все совершенно определенно ответят одинаково – «Да!» А вот на все следующие любой человек будет отвечать, исходя из того, что он чувствует на самом деле.

**– Крылья за спиной. Нужны ли они?**

– Я думаю, я практически уверен, что в жизни есть люди с крыльями и без них. Наличие крыльев предполагает **небезразличие**. Человек может выбрать между хорошим и плохим. Но самое худшее – если ему все равно.

**– Почему в твоих работах, на мой взгляд, божественное начало несколько второстепенно?**

– На самом деле это не так. Я близок к мнению Воланда в «Мастере и Маргарите»: «Что было бы со светом, если не было бы тени?»

**– Все твои работы проникнуты мифологической тематикой ...**

– Просто мифология воспринимается мной как другая изначальная сила, которая явно или неявно влияет на поступки каждого из нас.

**– Мифология славянская?**

– Мне она кажется все-таки больше западно-европейской.

**– Какие дальнейшие планы? Издали альбом и все?**

– Не-е-ет! То, что мы сейчас сделали – сайт, альбом – это пилотный проект. Если он получится, то у нас уже есть интересные задумки по созданию другого проекта в рамках «Черной линии», посвященного низшей мифологии, причем именно нашей, полесской. Кстати, мои иллюстрации будут использованы для оформления книги И. Штейнера и В. Новак «Народная міфалогія Гомельшчыны», которая готовится к изданию.

**Беседовала Юлия ЗИНОВЕНКО, студентка гр. БЖ-32 филфака.**

# ПОЧУВСТВУЙ СЕБЯ ПРЕКРАСНОЙ ДАМОЙ



***Восьмое марта... Каждый год эти слова дарят любой женщине возможность почувствовать себя прекрасной и ожидание чего-то необычного. Это – праздник особый. В этот день женщина лишается всех своих семейных и производственных ролей, всех "званий". Она больше не мать, не жена, не сестра, не коллега по работе, не одноклассница – она Женщина!***

Работающие женщины, я думаю, согласятся, что для них продолжительность праздника увеличивается почти вдвое. Предпраздничный рабочий день, по сути, сам становится праздником. Поздравления коллег, начальства, подчиненных, букеты цветов (или веточка мимозы), скромные чаепития или шикарные банкеты... Независимо от того, какое количество мужчин приходится на число женщин в трудовом коллективе, дамы возвращаются домой уже омытые первой теплой волной повышенного к себе внимания.

Но самое интересное начинается, конечно же, дома. Восьмого марта женщине совершенно ни к чему вскакивать раньше всех домочадцев и заниматься приготовлением утренней трапезы. Не такой сегодня день! Сегодня она имеет полное право чувствовать себя венценосной особой и наслаждаться таким положением. Правда, порой бывает чудовищно трудно удержаться и не "придти на помощь", ощущая доносящийся из кухни запах гари или слыша звон... разбившейся любимой вазы. Но вот все приготовления закончены. Вся из себя красивая женщина получает подарки, цветы и поцелуи.

Итак, каждая женщина, независимо от возраста и положения, считает день 8 Марта своим праздником. ***Чего же она ждет от этого дня, на что рассчитывает и что надеется получить?*** Конечно же, внимание, цветы, подарки и хорошее настроение.

Редкая женщина не получает своей доли ***мужского внимания*** в этот праздник. Согласитесь, что представителей сильной половины человечества 8 Марта буквально переполняет желание поздравить абсолютно каждую встретившуюся им представительницу прекрасного пола. Проявляются на каждом шагу их джентльменское поведение, галантность, предупредительность (порой так тщательно скрываемые в обычной жизни).

Следующим атрибутом праздника, конечно, являются ***цветы***. Пусть иногда мы кривим душой и просим своих любимых "не разоряться" на пышные букеты, пусть говорим, что поцелуй и забота для нас лучше любых подарков... Гордые розы или веточка "желтой радости", церемонные гвоздики или кактус в горшочке – все-таки без них праздник немного, но поблекнет, одну-две краски, но утратит.

Далее следует такой пункт программы, как ***подарки***. Некоторые мужчины наивно предполагают, что цветы – это и есть лучший подарок любимой женщине. Из различных соображений женщины с этим утверждением соглашаются. Но на самом-то деле цветы – это некий символ, штрих праздничной атмосферы. И хотя мы вполне можем ограничиться некоторыми штрихами, для полноты картины, завершенности восприятия нам необходим **Подарок**. Почему с большой буквы? Все очень просто. Ведь это подарок для Женщины — милой, дорогой, любимой, единственной, неповторимой. Мы живем в таком практичном мире и в такое практичное время, что один день в году мечтаем получить что-то необыкновенное, чудесное, загадочное...

Что же осталось? ***Хорошее настроение?*** Конечно же, без всякого сомнения, оно обеспечивается наличием тех компонентов, о которых говорилось чуть раньше.

Очень хочется, чтобы праздничное настроение оставалось с нами чуть больше, чем на один день. Хочется, чтобы воспоминания и впечатления от дня 8 Марта сохранялись весь год. Хочется получать знаки внимания, цветы и подарки поодиночке и в комплекте не раз в году, а чуть-чуть почаще. Хочется чувствовать себя просто Прекрасной дамой не только в официально объявленный Международный женский день 8 Марта, но и всегда.

**Анна БИРЕВА,**
**психолог.**

***Наверное, многие из вас не знают историю праздника, который мы так рьяно и ежегодно отмечаем 8 марта. А начиналось все так.***



Немного истории

## ПРАЗДНИК ИЗ ГЛУБИНЫ ВЕКОВ?

Уже в древнем Риме существовал женский день, который отмечали матроны. В этот день матроны - свободно рожденные женщины, состоящие в браке, получали от своих мужей подарки, были окружены любовью и вниманием. Рабыни тоже получали подарки. И кроме этого, хозяйка дома позволяла невольницам в этот день отдыхать. Облаченные в лучшие одежды, с благоухающими венками на головах, римлянки приходили в храм богини Весты - хранительницы домашнего очага.

Больше всех все-таки повезло римлянкам: замечательный день Любви, Красоты, Весны, посвященный женщинам, является у них праздничным много веков. Пожалуй, стоит подсчитать, сколько таких дней задолжали мужчины россиянкам. А сколько подарков мы не дополучили!..

Одни женщины отмечают первый весенний праздник по привычке, другие – потому что весна на дворе, а третьи, самые ортодоксально настроенные – в знак борьбы с сильным полом. Например, на Западе в этот (и не только) день имеют место акции феминисток или массовые шествия по предоставлению женщинам равных прав по вступлению в ряды полиции и Вооруженных Сил. Короче, каждый сходит с ума посвоему... А вообще, 8 Марта, остается "просто женским праздником": милых, нежных и отчасти беззащитных существ.

## НАИБОЛЕЕ ИЗВЕСТНЫЕ ФАКТЫ О ЖЕНЩИНЕ, ЕЕ ПРИРОДЕ И ПОВЕДЕНИИ

**Женщины обожают ходить по магазинам**. Это единственная область человеческой деятельности, где они с полным правом могут сказать, что «полностью контролируют ситуацию».

**Женщине всегда «нечего надеть».** (Не дай бог противопоставить этому утверждению замечания типа: «все вешалки в шкафу заполнены». Вам сразу недвусмысленно дадут понять, что вы ничего не понимаете).

**Плач необходим женщине, как воздух**. Но она не займется им в одиночку, если знает, что вы ее не слышите.

**Женщина всегда задает вопросы**, на которые вы не найдете правильного ответа. Это доставляет ей наслаждение, поскольку заставляет вас почувствовать свою вину.

*У женщины, если что и постоянно, так это переменчивость души.*

**Женщины очень разговорчивы**. Молчание пугает их, и они чувствуют необходимость заполнить вакуум, даже если нечего сказать.

**Женщине необходимо знать**, что кто-то где-то живет хуже, чем она или ее семья. Этим и объясняется невероятная популярность «мыльных опер».

**Женщины не умеют хранить тайну**. И не думают, что им нельзя доверять по причине раскрытия секрета двум или трем подружкам.



МАГИЯ ТАНЦА. Артистка шоу-балета А.Духовой «Тодес». Фото В.Чистика.

**Что бы женщина ни делала**, она **НИКОГДА** не презреет телефонный звонок и всегда подбежит к аппарату! В каком бы виде она ни была.

**Это единственное существо в мире**, которое, проведя два-три дня на отдыхе с подругой (дом отдыха, отель, дача и пр.) и вернувшись домой, немедленно позвонит той же подруге, чтобы поделиться впечатлениями!

**Женщина не в состоянии понять**, почему мужчины так любят «игрушки» (охоту, спорт, машины, дрели, удочки и т.д.). (Мужчины не испытывали бы в них необходимости, будь женщины снабжены кнопками: включить-выключить.)

**Среднее количество разных принадлежностей**, которые женщина держит в ванной комнате – 437 шт. (данные по Европе.) Мужчина может определить лишь шесть из них, включая собственную бритву и зубную пасту.

**Один из самых страшных пороков женщины состоит в том**, что она уверена, будто между сортами пива нет никакой разницы!

**Женщины – это существа, которые одеваются**, для того, чтобы: пойти на концерт, в магазин, полить цветы, сделать прическу, открыть дверь, ответить на телефонный звонок, прочесть книгу, прогулять собаку, достать почту...

**Женщина – единственное существо**, которое **НЕ ХОЧЕТ** правдивого ответа на вопрос: «Как я выгляжу?»

И это только начало...

**Собрал Федор АНДРЕЕВ.**

спорт спорт спорт спорт спорт спорт

## ЗНОЎ ПЕРШЫЯ

У г. Мінску завяршыліся Рэспубліканскія студэнцкія гульні па пауэрліфтынгу, у якіх прынялі ўдзел каманды 16 ВНУ.

У першай групе навучальных устаноў упэўнена перамаглі студэнты нашага універсітэта, у другой – БНТУ (Беларускі нацыянальны тэхнічны універсітэт) і ў трэцяй – БелДУТа.

На вышэйшую прыступку п'едэстала гонару ўзняліся: Павел Чакмароў (56 кг) і Пётр Клімкоў (+125 кг) – пяцікурснікі факультэта фізічнай культуры, чацвёртакурснік эканамічнага факультэта Максім Пятроўскі (52 кг).

Сярэбраных узнагарод удастоены студэнты другога курса факультэта фізічнай культуры Раман Кулеш (67,5) і Мікалай Жукоўскі (82,5), а таксама выпускнік гэтага ж факультэта Алег Паўлючок (90). Бронзавую ўзнагароду заваяваў чацвёртакурснік факультэта фізічнай культуры Уладзімір Арцёменка (67,5).

Трэніруе нашых асілкаў двухразовы чэмпіён Еўропы сярод ветэранаў, майстар спорту Уладзімір Галавач.

## ЁСЦЬ ЗАЛАТЫЯ І СЯРЭБРАНЫЯ ЎЗНАГАРОДЫ



Аматары спорту ведаюць, што ўжо два гады Палац лёгкай атлетыкі ў нашым горадзе знаходзіцца на рамонце. Адсутнасць такога спартыўнага будынка негатыўна адбіваецца на падрыхтоўцы лёгкаатлетаў ГДУ. І тым больш прыемнай была навіна аб тым, што на зімовым першынстве па лёгкай атлетыцы, якое прайшло ў г. Мінску, у праграме Рэспубліканскіх студэнцкіх гульняў, нашы студэнты факультэта фізічнай культуры заваявалі чатыры залатыя і тры сярэбраныя жэтоны.

На вышэйшую прыступку п'едэстала гонару ўзняліся: Вячаслаў Аліеў у бегу на 60 м – 6,93 сек, Валерыя Прахарэнка ў скачках у даўжыню – 5, 60 см, Ігар Федзік у скачках з шастом – 450 см і эстафетная каманда 4 па 200 м у складзе: Ігара Федзіка, Аляксандра Кіпцэвіча, Аляксея Раманава і Вячаслава Аліева – 1.31,5 сек.

Сярэбраных узнагарод удастоены Аляксандр Кіпцэвіч у бегу на 60 м з бар'ерамі – 8,15 сек, Вікторыя Прахарэнка ў трайным скачку – 12,74 см і Марыя Перавозчыкава ў скачках з шастом – 320 см.

У сувязі з гэтым хочацца выказаць словы ўдзячнасці трэнерска-выкладчыцкаму саставу кафедры лёгкай атлетыкі і лыжнага спорту, вучні якіх дабіліся такіх высокіх паказчыкаў. Неабходна памятаць, што ў склад Нацыянальнай каманды Беларусі ўваходзяць больш за палову студэнтаў ВНУ нашай краіны.

**В.МАРЧАНКА.**

## Улыбнитесь!

Жена проснулась накануне 8 Марта и говорит мужу:

– Знаешь, дорогой, мне сегодня приснилось, что ты мне даришь новый золотой браслет. Ты не знаешь, к чему бы это?

– Скоро узнаешь, – таинственно отвечает муж.

Вечером он возвращается домой со свертком в руках и торжественно преподносит его супруге. Она с замиранием сердца разворачивает бумагу и обнаруживает... "Толкователь снов".

## ОБЪЯВЛЯЕТСЯ КОНКУРС

***на лучшую научно-исследовательскую работу в ГГУ им. Ф.Скорины***

Конкурс проводится в три этапа: кафедра-факультет- конкурсная комиссия.

Работы в конкурсную комиссию должны быть представлены не позднее **1 апреля 2003 г.**

За справками обращаться в СНТИ НИСа: главный корпус, к. 5-6.

**ГОМЕЛЬСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ ІМЯ Ф.СКАРЫНЫ**

**аб'яўляе конкурс на замяшчэнне вакантных пасад па кафедрах:**

– гісторыі Беларусі –дацэнта;
– англійскай мовы – выкладчыка;
– нямецкай мовы – выкладчыка;
– вышэйшай матэматыкі –дацэнта;
– эканомікі і кіравання вытворчасцю –дацэнта.

**Тэрмін падачы заяў – не пазней 1 месяца з дня апублікавання паведамлення.**

**Заявы накіроўваць на адрас: 246699, г. Гомель, вул. Савецкая, 104.**

**РЭКТАРАТ.**

Аўтары надрукаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць прыведзеных фактаў, цытат, эканамічных даных, асабістых імён, геаграфічных назваў і іншай інфармацыі, а таксама за тое, каб у матэрыялах не ўтрымлівалася даных, якія не падлягаюць адкрытай публікацыі. Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не раздзяляючы пункту гледжання аўтара.

ЗАСНАВАЛЬНІК — Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф.Скарыны.

Наш адрас: 246699, г. Гомель, вул. Савецкая, 104, пакой 2-14. Тэл. 56-30-71. E-mail: rggu@gsu.unibel.by
Зарэгістравана ў Міністэрстве інфармацыі Рэспублікі Беларусь 26 чэрвеня 1996г. Рэгістрацыйны № 263.

Спонсар газеты — прафкам студэнтаў.

Газета набрана і сверстана на настольно-издательском комплексе ИВЦ ГГУ, отпечатана на Республиканском полиграфическом унитарном предприятии "Полеспечать", г.Гомель, ул. Советская, 1. Якасць друку адпавядае якасці арыгіналаў заказчыка.

РЭДАКТАР Тамара ДУБЯК

Аб'ём 1 друк. арк.
Тыраж 1.000 экз.
Заказ 4112
Падпісана да друку 4.03.2003 г.